www.nv-online.info

Народная Воля

№ 68 (3809)

30 жніўня 2013 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец: УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

*На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...*

Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

ЦИТАТНИК

Мы помним, как все начиналось...

“Недавно приехал ко мне богатейший человек России, Керимов — хозяин всего калийного рынка в России. Спрашиваю у него:
— Какие проблемы?
— Вы мне обещали участок возле Беловежской пущи...
— Пожалуйста, бери деревню, хоть две, хоть три...”

Александр Лукашенко, выступление во время послания Национальному собранию, 2011 год.

АКТУАЛИИ



Светлана КАЛИНКИНА

Welcome!

Один человек, которого жалко во всей этой истории с гендиректором “Уралкалия”, — мама Владислава Баумгертнера.

Внезапный арест в дикой стране вполне успешного и благополучного сына. Немолодая женщина мчится в Минск, чтобы его срочно увидеть, но не то что увидеть — не может передать в камеру даже простейшие вещи: трусы-носки-свитер...

Она бродит под стенами белорусского КГБ, потому что так кажется, что сквозь толстые стены ее сын все-таки почувствует родную душу. Она с надеждой смотрит в безразличные окна ведомства наследников Дзержинского, будто за 85 последних лет в них кто-нибудь видел что-нибудь хорошее. Она готова часами об одном и том же расспрашивать адвоката, потому что он единственное доказательство, что сын вообще жив...

Сколько раз это было! Сколько белорусских матерей не могли понять: за что? Сколько задавались вопросом: “Как же такое может быть? Ведь это Европа, XXI век? Откуда такая дикость?”

Баумгертнера мне не жалко. И Керимова хорошо бы в соседнюю камеру посадить. И Волошина.

Потому что они прекрасно знали, с кем ведут бизнес. Более того, они рвались сюда именно потому, что в Беларуси возможен шахер-махер, нет законов, игра идет без правил. Подарил президенту “Майбах” — и сразу все позволено.

А еще послу России Сурикову стоило бы шконку выделить. Вместе с российским МИДом, депутатами Госдумы и многими-многими, кто в Москве из штанов выпрыгивал, расхваливая белорусские порядки.

Сколько раз мы от них слышали, что Беларусь — правовое демократическое государство, которое Запад подвергает несправедливым нападкам! Сколько раз они убеждали и мир, и нас, и себя, что все отлично в Беларуси с правами человека! Что хороший в Беларуси президент и другой нам не нужен.

Практически все кандидаты в президенты на последних выборах были арестованы, но Россия поздравила Лукашенко с честной победой и стала стеной на его защиту на международной арене.

Адвокатов к арестованным не допускали, письма и передачи не позволяли — российский МИД говорил о национальных особенностях демократии.

Когда весь цивилизованный мир требовал освобождения белорусских политзаключенных, Россия твердила: “Есть суд, все будет по закону”.

Что же это сегодня они не вспоминают про справедливый белорусский суд, который невинных не осудит? Что же теперь прямо противоположное говорят: “Средневековье, дикость, выпустите немедленно!”?

А когда кандидата в президенты Владимира Некляева избили до бессознательного состояния еще до закрытия избирательных участков, когда его вытянули на одеялах прямо из больничной палаты и заволокли в СИЗО — это не было дикостью и средневековьем?..

Долго уже правит Лукашенко с российской помощью, и примеров можно приводить много. Потому будет справедливо и правильно, чтобы каждого, кто надеялся или надеется словить что-то в белорусских мутных водах, договорившись лично с Лукашенко, постигала судьба Баумгертнера — камера в “американке”.

Независимо от того, из России эти партнеры-адвокаты-поклонники, из США или из Гваделупы. Потому что с добрыми намерениями честного бизнеса в нынешние белорусские условия никто не пойдет.

Приезжайте! Welcome! Убедитесь, что в камерах бедненько, но чистенько! И что первыми объектами, которые надо было у нас приватизировать, прежде чем строить какие-то планы, являются белорусские тюрьмы.

Вот только матерей жалко... Они страдают одинаково — и мамы миллиардеров, которые пели хвалебные оды нынешним белорусским порядкам, и мамы нищих студентов, которые ненавидят эти порядки до отчаянного безрассудства.

СКАНДАЛ

Слетал за всех

Информация подтвердилась. Генеральный директор “Уралкалия” Владислав Баумгертнер прилетел на официальные переговоры с премьер-министром Беларуси по его приглашению и был задержан. Аналогичные приглашения прибыть в Минск получили один из главных акционеров “Уралкалия” Сулейман Керимов и председатель наблюдательного совета, бывший глава Администрации президента России Александр Волошин. Правда, они прибыть в Минск не смогли. Баумгертнер слетал за всех...

Сегодня можно только гадать, был ли у Минска план арестовать всех приглашенных гостей или только Владислава Баумгертнера, однако очевидно, что Михаил Мясникович выступил в роли наживки. Среди журналистов даже шутка теперь гуляет: график встреч белорусского премьер-министра можно публиковать под рубрикой “Криминальная хроника”.

Знал ли Мясникович о готовящейся операции силовиков, приглашая Керимова, Волошина и Баумгертнера на переговоры в Минск? Об этом можно только догадываться. От каких-либо комментариев Мясникович отказался. Правда, неофициально стали распространяться слухи, что для него произошедшее стало такой же неожиданностью, как и для всех остальных. И что после этого премьер имел разговор с президентом на повышенных тонах, после которого написал заявление об отставке.

Пресс-секретарь главы правительства Ольга Долгая твердит, как заведенная: “У премьер-министра запланирован ряд рабочих встреч”. Это, видимо, с намеком на то, что еще находятся смельчаки, которые не боятся принимать приглашение главы белорусского правительства. Однако добиться внятного ответа на вопрос, написал Мясникович заявление об отставке или все-таки нет, невозможно. Ольга Долгая ссылается на то, что слухи не комментирует. Обычно такие уловки означают: “Не могу подтвердить, но и не могу опровергнуть”.

Аналогичная ситуация и с министром экономики Николаем Снопковым. По слухам, он тоже подал заявление об отставке. А вот по официальной информации у Снопкова “запланирован ряд рабочих встреч”.

Не исключено, конечно, что никаких заявлений никто не писал, а слухи — это только попытка спасти репутацию Мясниковича, Снопкова и всех тех, кто настойчиво зазывает в Беларусь инвесторов, убеждая их, что мы — страна цивилизованная. А какими слухами спасти репутацию Беларуси?

Елена ДАВЫДОВА.



ПРЭМ'ЕР-МІНІСТР РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
ПРЕМЬЕР-МИНИСТР РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Минск, 20 августа 2013 года

Уважаемый Владислав Артурович,

Приглашаю Вас 26 августа 2013 года в г.Минск для рассмотрения вопросов, связанных с деятельностью ЗАО "Белорусская калийная компания".

Михаил Мясникович

Господину Владиславу Баумгертнеру
Генеральному директору
ОАО "Уралкалий"

Копия: Заместителю Председателя Правительства Российской Федерации Дворковичу А.В.

РЕБУС

За что повысили Иванова?

Кто является руководителем компании и непосредственно отвечает за ее деятельность?

Вопрос не праздный.

Потому что генеральный директор “Белорусской компании” Валерий Иванов месяц назад получил повышение в должности и стал заместителем главы Администрации президента. А вот некоторые его бывшие подчиненные — в розыске. Председатель наблюдательного совета БКК — за решеткой. Белорусские эксперты, которые заполонили белорусские телеканалы, говорят об огромном ущербе, который нанесен БКК. Так отвечает ли гендиректор за деятельность компании?..

Юрист **Игорь ВОЙТИК** поначалу решил, что мы просто разыгрываем его, задавая такой вопрос.

“Естественно, оперативное управление работой акционерного общества осуществляет генеральный директор. Он имеет право подписи, он принимает решения. Компетенция совета директоров или наблюдательного совета — общее, стратегическое руководство. Этот орган собирается два-три раза в год, решения здесь принимаются не единолично, а голосованием”, — пояснил Игорь Войтик.

Таким образом, если все, что сейчас говорится о деятельности БКК в белорусском информационном пространстве, — правда, то совершенно непонятно: за что Валерия Иванова повысили в должности? Почему он не в СИЗО?

Олег СНОВ.



РЕЗОНАНС

Высокие отношения

После ареста в Минске генерального директора “Уралкалия” Владислава Баумгертнера российские политики будто в один день прозрели. Теперь белорусские нравы и порядки им разонравились.

***

“Беларусь нарушила элементарные правила приличия, задержав представителя российской компании в досаде от не устроивших белорусскую сторону результатов деловых переговоров. Это неприлично — так не поступают даже в тех странах, которые не имеют статуса союзного с Россией государства”, — заявил **глава международного комитета Совета Федерации Михаил Маргелов.**

***

“Мне сложно судить о деталях разногласий, возникших в отношениях “Уралкалия”, “Белорусской калийной компании” и “Беларуськалия”, однако решение спорных экономических вопросов на международном уровне силовыми методами — это нонсенс. Это не красит наших белорусских партнеров и не способствует укреплению экономических отношений... Да и по-человечески я Владиславу Артуровичу очень сочувствую. Он оказался в ситуации, отдающей каким-то средневековьем. Быть приглашенным на переговоры только для того, чтобы оказаться за решеткой! Более того, учитывая масштаб связанных с этим задержанием экономических вопросов, дальнейшая ситуация может развиваться непредсказуемо”, — написал в своем блоге **губернатор Пермского края Виктор Басаргин.**

***

“Имеет место какая-то непонятная дискредитация власти”, — заявил **посол России в Минске Александр Суриков** в интервью корреспондентам российских телеканалов.

“Я такой международной практики вообще не знаю: когда власть приглашает, а потом правоохранительные органы задерживают. Наверное, приглашение является своего рода гарантией безопасности, и действия потом правоохранительных органов в данной ситуации не совсем корректны по отношению к собственной власти”, — сказал дипломат.

***

“Мы считаем ситуацию странной, неадекватной и непартнерской. Мы сожалеем, что она развивается так жестко. Это не укладывается ни в какие рамки”, — заявил **первый вице-премьер России Игорь Шувалов**.

***

“Я хорошо знаю Владислава Баумгертнера как честного и глубоко порядочного человека, законопослушного гражданина, профессионала мирового уровня.

Представляются более чем странными заявления представителей следственных органов Беларуси о всякого рода нарушениях законодательства со стороны менеджеров Белорусской калийной компании. Эти обвинения противоречат здравому смыслу и не выдерживают никакой критики.

Хотел бы отметить, что наблюдательный совет Белорусской калийной компании, который возглавляет В.Баумгертнер, является надзорным органом, собирающимся лишь несколько раз в год. Председатель наблюдательного совета не имеет абсолютно никаких служебных полномочий, которыми он мог бы злоупотребить. Реальным руководителем компании является генеральный директор, который всегда номинировался белорусской стороной.

Несколько недель назад генеральный директор БКК был назначен на одну из высших должностей в Беларуси, а именно на должность заместителя главы Администрации президента страны. Это, думаю, означает, что результаты деятельности этой компании и состояние дел в ней весьма высоко оцениваются высшим руководством Беларуси. В данной связи обвинения в должностных преступлениях в адрес В.Баумгертнера выглядят просто нелепо.

Как председатель совета директоров “Уралкалия” я требую немедленного освобождения Владислава Баумгертнера и прекращения преследования его коллег”.

Официальное заявление бывшего главы Администрации президента России, председателя совета директоров “Уралкалия” Александра Волошина.

ТЕМ ВРЕМЕНЕМ

Просто совпадение?..

С 1 сентября компания “Транснефть” на четверть сократит поставки нефти в Беларусь.

200 тысяч тонн недополучит Мозырский НПЗ и столько же “Нафтан”.

Как объяснил вице-президент “Транснефти” Михаил Барков, “во избежание технологических проблем на нефтепроводе “Дружба” предстоит замена трубы”. Таким образом, с 1 сентября в направлении Беларуси сократятся поставки нефти в объеме 400 тысяч тонн — по 200 тысяч на Мозырский НПЗ и на “Нафтан”. В противном случае прокачка нефти будет представлять “экологическую опасность”.

Белорусов это сообщение застало врасплох. Как и российские нефтяные компании, которые поставляют нам нефть именно по трубам “Транснефти”.

Однако это было не последнее сообщение из Москвы, прозвучавшее громом среди ясного неба. Главный санитарный врач России Геннадий Онищенко объявил широкой общественности, что белорусское молоко не соответствует Техническому регламенту по содержанию бактерий. Как всем хорошо известно, очень часто такие заявления заканчиваются запретом на ввоз.

“Похоже, нас ждет новая торговая война между Россией и Беларусью”, — в один голос заговорили эксперты, намекая на то, что Кремль не мог не отреагировать на арест гендиректора и члена совета директоров крупнейшей компании России.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Зміцер ДАШКЕВІЧ:

«Я ўсё той жа!»

28 жніўня ў 6.15 раніцы Зміцер Дашкевіч выйшаў з брамы Гродзенскай турмы, прайшоў некалькі метраў і трапіў у абдымкі жонкі і сяброў. Журналісты кінуліся фатаграфаваць палітвязня, людзей станавілася ўсё больш і больш, бо некаторыя ў гэты ранні час былі ў кавярнях, дзе змагаліся са сном з дапамогай кавы, бо чакалі Дашкевіча яшчэ з вечара, пільнавалі героя ля турэмных сцен усю ноч. А выйшаў — дык і не адразу пазналі. Толькі калі ўжо ўсміхнуўся...

Нагадаем, што лідара “Маладога фронту” (арганізацыі, не зарэгістраванай у Беларусі, але зарэгістраванай у Чэхіі) Зміцера Дашкевіча затрымалі 18 снежня за дзень да галасавання на прэзідэнцкіх выбарах 2010 года. Людзі ў цывільным збілі яго з ног, заламалі рукі і закінулі ў машыну. Потым, праўда, “высветлілася”, што гэта, наадварот, Зміцер Дашкевіч і яго сябра Эдуард Лобаў накінуліся ў двары дома на “няшчасных” мужчын, якія нават на судзе сваіх прозвішчаў не назвалі і твараў не паказалі.

Адразу з Гродна Зміцер накіраваўся ў Старыя Дарогі, каб наведаць бацьку, які за гэты час захварэў на анкалогію, і магілу маці — Вольга Дашкевіч памерла, калі сын знаходзіўся ў следчым ізалятары. З “Народнай Воляй” Зміцер размаўляў ужо на шляху ў Мінск: хлопцу трэба было паспець да 17.00 стаць на ўлік у міліцыі Першамайскага раёна, бо і цяпер былы палітвязень будзе знаходзіцца пад наглядам пільных праваахоўнікаў.

Тым не менш сваю грамадска-палітычную дзейнасць Дашкевіч спыняць не збіраецца. Пакуль ён дакладна не ведае, чым будзе займацца, але ад лідарства ў “Маладым фронце” ён вырашыў адмовіцца.

— Ну які я цяпер лідар “Маладога фронту”? Колькі мне гадоў і колькі актывістам арганізацыі? Там жа 18-гадовыя. Я, канешне, буду ўсяляк дапамагаць ім, але займацца хачу іншай справай. Якой?.. Час пакажа.

— Ёсць адчуванне, што за той час, пакуль цябе не было, усё моцна змянілася?

— Ды нічога і не змянілася. Людзі, якія былі добрымі людзьмі, так і засталіся добрымі. Некаторыя ўжо і дзяцей нарадзілі. Гэта ж такі натуральны працэс. А так... усё, як і было.

— Не збіраешся паўтарыць шлях Саннікава ды іншых некаторых апазіцыянераў?

— Не. Нават калі прыцісне. Я паспрабую ўладкавацца на працу. Не будуць браць — усё роўна нейкае выйсце знойдзецца. Трэба жыць на радзіме.

— Ты сам пісаў, што там, за калючым дротам, перажыў сапраўднае пекла. Ці ёсць адчуванне, што ты ўжо не той, што быў?

— Я ўсё той жа! Усе выпрабаванні толькі далі зразумець, што добрых людзей сапраўды больш, чым кепскіх. Там, на зоне, дарэчы, людзі чытаюць “Народную Волю”. Я вельмі ўдзячны тым людзям, якія мяне падтрымлівалі. Прычым гэта былі і асуджаныя, і супрацоўнікі калоній. Я дакладна ведаю, што некаторыя з асуджаных, калі адмовіліся рабіць правакацыі супраць мяне, не выйшлі з зоны датэрмінова, падоўжылі сабе тэрмін адсідкі на некалькі гадоў. Ці лёгка рабіць такі выбар?.. Увогуле, да “палітычных” усе ставяцца добра і ім усяляк дапамагаюць. Нават адміністрацыя можа пайсці на рэпрэсіі супраць “палітычных” толькі пад уздзеяннем іншых сіл. Таму для любой калоніі ці турмы наяўнасць палітзэка — гэта адны праблемы. Начальства калоніі толькі радуецца, калі нас ад іх забіраюць у нейкае іншае месца. Тым не менш нават у Горках, дзе я адчуваў бязмежжа ў дачыненні да сябе, знаходзіліся людзі, якія мяне ўсяляк падтрымлівалі. Хаця б нават тым, што рабілі мне гарбату...

— Калі ты быў у поўнай ізаляцыі, у штрафным ізалятары, калі не атрымліваў лістоў, ты адчуваў, што за цябе ідзе нейкая барацьба на волі? Можа чалавек там паверыць, што пра яго ўсе забыліся?

— Канешне, я адчуваў. Я ведаў, што пра мяне не забудуцца, ведаў, што будуць патрабаваць вызвалення і майго, і ўсіх палітзняволеных. Ведаў і верыў.

— Цяпер, калі прайшоў час, ці не думаеш, што, можа, не варта было тады, 18 снежня, напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў увогуле выходзіць з дому? Можна ж было пачакаць пару дзён...

— Не. У нас была задача недзе схавацца да 19 снежня. Мы ж памяталі сітуацыю 2006 года, калі сотні людзей трапілі за краты яшчэ за два тыдні да дня галасавання 19 сакавіка. (Сядзела ж ледзь не тысяча чалавек.) Таму ў 2010-м мы сышлі на чужую кватэру, тэлефонамі не карысталіся. І раптам бачым, што кватэра абкладзена. Што рабіць? Падумалі, што ўсё ж такі ўдасца вырвацца: нікога ж яшчэ не хапалі і не саджалі. Гэта з аднаго боку. А з другога — разумелі, што калі не вырвемся, то ў дзень выбараў нам дакладна нават не дадуць выйсці. А ўжо што атрымалася — тое атрымалася.

Цяпер Насту і Зміцера чакае вянчанне. Шлюб быў аформлены на паперы прама ў турме, але ў бліжэйшыя выхадныя адбудзецца сапраўднае вяселле, на якім сябры маладых змогуць іх павіншаваць і парадавацца за іх лёс. Усе разумеюць, што дарога не будзе простай, але менавіта ў гэтыя дні пра гэта не хочацца думаць.

Любоў ЛУНЁВА.



Народная Воля http://www.nv-online.info
30 ЖНІЎНЯ 2013 г.

РАКУРС

Белорусские военные пенсионеры стали переходить на российскую пенсию

Она почти в два раза выше.

“Народная Воля” выяснила, довольны ли белорусские генералы своей пенсией.

Павел КОЗЛОВСКИЙ: *«Пусть лучше российский бюджет трещит!»*

Экс-министр обороны Беларуси, генерал-полковник **Павел Козловский** *отмечает: даже после последнего повышения пенсии наши военные пенсионеры получают значительно меньше своих российских коллег.*

— У меня есть знакомые, в том числе и генералы, которые перевелись на российскую пенсию, — *говорит Павел Павлович.* — И очень довольны! Мне тоже говорили: переводись! Но я не захотел. Патриот своей страны!

Одно время волна переходов на российскую пенсию действительно была заметной, потому что разница с той же Россией была огромной — российские пенсионеры в погонах получали в два-три раза больше! А сейчас людям в погонах немного добавили пенсию.

Если мы на самом деле строим с Россией Союзное государство, то, на мой взгляд, и заработная плата, и пенсионное обеспечение должны как-то соответствовать. А то получается какая-то стыдоба: наши офицеры унижаются, ищут, у кого бы в России зарегистрироваться, чтобы вместо 600 долларов получить 1500! С другой стороны, осудить этих людей тоже нельзя. Согласитесь, разница в деньгах совсем не маленькая, а жизнь у нас не бесплатная...

Мне кажется, что белорусские власти втихаря, может быть, даже посмеивались над этой ситуацией. Если разобраться, нам выгодно, чтобы военные пенсионеры переводились на российскую пенсию: пусть лучше российский бюджет трещит по швам, а свой мы беречь будем!

Сколько у меня сегодня пенсия? Примерно 800 долларов. Не считаю, что это большие деньги: все моментально обесценивается, цены, сами знаете, ползут вверх каждый день...



Мечислав ГРИБ: *«Офицеры получали меньше, чем госслужащие...»*

Председатель Верховного Совета 12-го созыва, генерал-лейтенант милиции **Мечислав Гриб** *недавно перевелся с пенсии госслужащего на офицерскую.*

— Я имею право выбрать один из четырех видов пенсии, — *рассказал “Народной Воле” Мечислав Иванович.* — Могу получать пенсию по возрасту, по выслуге лет в органах внутренних дел, как госслужащий и как председатель Верховного Совета. Последний вариант, естественно, сразу отпадает, потому что это 3 рубля 60 копеек. Самая большая ценность пенсии — ее размер, поэтому обычно все выбирают ту, которая больше.

До недавнего времени те, у кого была возможность, меняли офицерскую пенсию на пенсию госслужащего — она была выше. Но для этого нужен был стаж (не менее 20 лет), а у нас не вся служба в органах внутренних дел засчитывается в госслужбу.

Кстати, до 1 августа экс-министр внутренних дел или министр обороны получали пенсию меньшую, чем госслужащие. А госслужащим может быть ведь и секретарь сельского совета, и зампредисполкома...

Что касается российской пенсии, то ее можно получать, имея местную регистрацию (как раньше говорили — прописку). Если в России есть родственники (или возможность получить регистрацию), то белорусские офицеры могут значительно выиграть в деньгах. И некоторые пользуются этой возможностью. Знаю, что российские генералы, которые были в должности начальников главков, имеют пенсию около 2,5 тысячи долларов в эквиваленте. А у наших даже после последней добавки — ровно наполовину меньше! Да и то не у всех. Абсолютное большинство белорусских офицеров получает пенсию в три раза меньшую, чем их российские коллеги. В этом смысле мы значительно отстаем от России. Поэтому те, у кого есть там родственники, связи или работа, переводятся на российские пенсии. Это касается и военных, и сотрудников органов внутренних дел, и КГБ — всех!

До недавнего времени я получал пенсию как госслужащий — у меня 29 календарных лет выслуги. Максимальная пенсия была 6 миллионов 700 тысяч. Но сейчас я вернулся в родное лоно органов внутренних дел. Это связано с некоторыми вопросами медицинского обслуживания. Как я уже говорил, до последнего повышения, которое произошло где-то в конце июля, офицерская пенсия была меньше, чем пенсия госслужащего...

Валерий ФРОЛОВ: *«Лишние три миллиона не помешают...»*

Генерал-майор **Валерий Фролов** *предупреждает: перевод на российскую пенсию потребует немало времени и сил.*

— Я тоже хотел переоформиться, но это довольно непростая процедура, и пока не решился, — *признается Валерий Дмитриевич.* — Ребята, которые уже перешли на российскую пенсию, расписали мне буквально каждый шаг. Российский генерал получает примерно 2000 долларов, а в наш — 700—800. Так чего при такой разбежке не поднапрячься? Деньги лишними не бывают...

Стоит заметить, что сейчас белорусским офицерам значительно повысили пенсии. Например, у меня товарищ получал 3,5 миллиона, а сейчас — 5,5. Генералы, думаю, сегодня чуть больше 7 миллионов имеют.

Когда бываю в Москве, всегда интересуюсь у своих бывших сослуживцев, сколько они получают. И вот, например, когда я получал довольно высокую по нашим меркам депутатскую пенсию — около 700 долларов, они имели примерно 1500—2000 долларов. Знакомый российский генерал-полковник получает пенсию около 3000 тысяч долларов. Одним словом, нам есть к чему стремиться!

Ну представьте: мужики вместе были в Афгане, сейчас в одном звании, и когда спрашиваешь про пенсию, оказывается, что белорусы нищие по сравнению со своими российскими коллегами! Недовольство среди людей в погонах росло. Не исключено, что этот фактор повлиял на то, что недавно военные пенсии увеличили. На мой взгляд, просто смешно, когда рубщик мяса получает 8 миллионов, а офицер — 3,5 миллиона... Поэтому некоторые офицеры и перешли на российскую пенсию. Еще раз повторю, что нужно собрать немало бумаг, пройти медкомиссию, получить регистрацию, но, в конце концов, многие приходят к выводу, что овчинка стоит выделки... Одним словом, есть люди целеустремленные. Знаю, что некоторых моих товарищей жены пилят — этот фактор тоже может придавать ускорение...

Я пока получаю депутатскую пенсию. Думал, раз военным повысили, значит, и здесь должны. Но в последний раз банкомат выдал мне все те же 6 миллионов 300 тысяч. Позвонил знакомому депутату, который занимается этим вопросом, так он обрадовал: сейчас уже 9.200.000. Но я еще повышения не ощутил. Хотя лишние три миллиона не помешают...

Некоторые меня упрекают в том, что я перешел на депутатскую пенсию. Но меня совесть не мучает. Я считаю, что в Палате представителей штаны не просиживал, а действительно работал. И имею право на эту пенсию...

Владимир ЕГОРОВ: *«Парламентская пенсия была выше генеральской»*

Экс-глава МВД и КГБ Беларуси генерал-полковник **Владимир Егоров** *не скрывает: пенсия — его единственный источник дохода. После ухода со всех должностей он остался не у дел. Тем не менее на российскую пенсию Егоров переводиться не намерен.*

— Я как гражданин и патриот своей страны получаю белорусскую пенсию, — *сказал Владимир Демьянович “Народной Воле”.* — О российской даже и не задумывался!

В свое время я решил получать парламентскую пенсию — она была выше генеральской. Но если узнаю, что сейчас ситуация изменилась, то у меня есть право выбрать ту, которая выше. Так что буду смотреть... Тем более что других источников дохода у меня нет — после ухода в отставку я нигде не работал и не работаю...

Марина КОКТЫШ.

АКТУАЛЬНА

Тарыфы на камуналку павялічацца

Калі вырастуць заробкі — вырастуць і тарыфы ЖКГ.

Пра гэта сказаў міністр эканомікі **Мікалай Снапкоў** падчас “прамой лініі” ў рэдакцыі адной з дзяржаўных газет.

“Павышэнне будзе плаўнае, але мэтанакіраванае, — цытуе euroradio.fm чыноўніка. — *Каб плацяжы па камуналцы ў сярэднім спажывецкім кошыку складалі не 7—8%, а набліжаліся да больш справядлівых. Парог, на нашу думку, 15%”.*

ПАРАЛЕЛІ

Першыя па росце цэн

Беларусь заняла першае месца сярод краін — рэспублік былога СССР па росце спажывецкіх цэн у студзені—ліпені 2013 года.

За сем месяцаў цэны ў Беларусі павялічыліся на 8%. Вось як за гэты ж час выраслі цэны ў суседніх краінах: **Расія** — 4,4%; **Арменія** — 3,2%; **Казахстан** — 2,8%; **Эстонія** — 2,5%; **Таджыкістан** — 1,6%; **Малдова** — 1, 3%; **Кыргызстан** — 1,2%; **Азербайджан** — 0,5%; **Латвія** — 0,2%; **Украіна** — 0,1%.

Не змяніліся цэны ў **Літве**, знізіліся ў **Грузіі** — на 0,9% і **Туркменістане** — на 1,7% (за першае паўгоддзе). Няма даных па **Узбекістане**. У самаабвешчанай **Прыднястроўскай Малдаўскай Рэспубліцы** цэны ў студзені—ліпені павысіліся на 2,4%.

У ліпені з паказчыкам росту коштаў на 1% Беларусь таксама заняла першае месца. Ззаду — **Расія** (0,8%), **Арменія** (0,4%) і **Казахстан** (0,2%). Цэны зменшыліся ў **Таджыкістане, Украіне, Эстоніі** (0,1%), **Кыргызстане, Латвіі** (0,3%), **Азербайджане, Літве** (0,7%), **Малдове** (1%) і **Грузіі** (1,3%). Як адзначае БелаПАН, па выніках 2011-га і 2012 гадоў Беларусь была першай па росце коштаў сярод краін — рэспублік былога СССР (108,7 і 21,8%).

БУДЗЬЦЕ ЗДАРОВЫ!

Валянціна БАРАДУЛІНА: «Дактары абнадзеілі — з Рыгорам нічога страшнага»



Гэта сёння Валянціна Міхайлаўна крыху супакоілася. А 27 жніўня, прыбегшы на трывожны крык унучкі ў рабочы кабінет мужа, убачыла яго ў непрытомным стане на падлозе каля стала. І сама ледзь не страціла прытомнасць...

— На шчасце, “хуткая” прымчала сапраўды хутка, — распавядае жонка народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна. — *Яго тут жа адвезлі ў бальніцу “лечкамісіі”, хоць ён пачаў ужо ачомвацца. Там тэрмінова зрабілі першыя абследаванні і заспакоілі: так, Рыгор Іванавіч пры падзенні стукнуўся галавой, але нічога страшнага, усё павінна быць добра. Толькі варта прайсці больш глыбокае абследаванне і курс лячэння. Рыгора перавялі ўжо з хірургічнага ў неўралагічнае аддзяленне, прымаюць усе меры для вяртання ў нармальны стан.*

Мы з Рыгорам з палёгкай уздыхнулі. Да яго вяртаецца баявы настрой, нават свае блакноты і ручку папрасіў мяне прынесці з дому ў палату. Прывык жа працаваць, працаваць штодня, без гэтага проста не можа. Думаю якраз гэта, разам з высокапрафесійнай і сардэчнай увагай дактараў, дапамагло яму ачуняць пасля атрыманай паўгода таму, цяжкай траўмы, вярнуцца да актыўнага творчага жыцця. Так што нас саграве надзея: дажывём да выпіскі!

І мы шчыра верым, што ў Вас, дарагі Рыгор Іванавіч, усё пойдзе на лепшае, Вы адчуеце прыліў новых сіл, зноў возьмецеся за пяро на радасць усім, хто любіць Ваш магутны і непаўторны паэтычны дар, Вашу ўзвышаную душу, навечна ўлюбёную ў Беларусь.

Хутчэй папраўляйцеся, і ўсё будзе добра!

З глыбокай павагай —

рэдакцыя “Народнай Волі” і нашы — Вашы чытачы.

КАМПЕТЭНТНА

Вадзім ІОСУБ: *«Рубель паступова абясцэньваецца»*

Учора на таргах Беларускай валютна-фондавай біржы курс долара вырас на 30 рублёў і ўстанавіў новы абсалютны максімум — 8990 беларускіх рублёў.

Сітуацыю на валютным рынку каментуе “Народнай Волі” фінансавы аналітык афіцыйнага партнёра “Альпары” ў Мінску Вадзім ІОСУБ.

— Статыстыка сведчыць: за першае паўгоддзе гэтага года пакупка валюты насельніцтвам перавысіла яе продаж на 167 млн доларaў...

— Сітуацыя лагічная, і вызначаецца яна тэмпамі росту заробкаў людзей. А тэмпы гэтыя апярэджваюць тэмпы росту прадукцыйнасці працы. Адным словам, заробкі не адпавядае таму, што за гэты час генерыравала нацыянальная эканоміка. Людзі атрымалі больш грошай, а значыцца, пераводзяць іх альбо ў імпартныя тавары, альбо ў замежную валюту. Да таго ж сярод насельніцтва ў канцы чэрвеня — пачатку ліпеня пачалася невялікая паніка, калі долар пачаў расці.

— Беларусы аддаюць перавагу зберажэнням у замежнай валюце, хоць па дэпазітах у беларускіх рублях павысілі працэнтныя стаўкі. Людзі баяцца, каб іх чарговы раз не падманулі?

— За большую частку існавання беларускай суверэннай дзяржавы рублёвыя стаўкі сябе не апраўдвалі, бо адставалі і ад тэмпаў дэвальвацыі, і ад тэмпаў інфляцыі. Таму народ проста губляў грошы. Адсюль і некаторы недавер да такіх дэпазітаў. Хоць на сённяшні момант захоўваць грошы на рублёвых дэпазітах больш выгадна.

— Курс долара марудна, але расце. Ці можна гэта назваць плаўнай дэвальвацыяй?

— Ёсць факт таго, што рубель паступова абясцэньваецца. А ад таго, як гэты працэс назавеш, сутнасць не зменіцца. Для людзей больш важна тое, наколькі знізіцца рубель, а не назва працэсу.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

МАЙЦЕ НА ЎВАЗЕ!

Прыбіраць у мінскіх пад’ездах будуць у два разы радзей

І заробак у дворнікаў зменшыцца.

У адпаведнасці з пастановай Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі мяняецца перыядычнасць прыбірання пад’ездаў, лесвічных пляцовак і снегу на прыдамавых тэрыторыях. ***Так, калі раней пад’езды мылі адзін раз на тыдзень, то цяпер будуць мыць раз на два тыдні. Падмяталі пад’езды і лесвічныя пляцоўкі кожны дзень, цяпер — праз дзень. У адпаведнасці з пастановай прыбіраць тэрыторыю двара ад снегу будуць раз на дзень, мыць вокны ў пад’ездзе — раз на год, вясной.***

“*Такой колькасці будзе дастаткова, каб падтрымліваць парадак,* — цытуе агенцтва “Мінск-Навіны” гендырэктара МГЖГ **Уладзіміра Хадарцэвіча**. — *Акрамя таго, знізіцца нагрузка: большасць дворнікаў выконваюць 1,5 нормы, гэтая лічба зменшыцца да 1,2. Вядома, крыху знізіцца і заробак: сёння дворнікі атрымліваюць у сярэднім 3,3 мільёна рублёў. Зрэшты, тыя, хто захоча, змогуць па-ранейшаму браць дадатковыя аб’ёмы. Галоўнае, каб людзі разумелі, што грошы трэба зарабіць”.*

ЗАКУЛІССЕ

Украінска-беларускі кот у мяшку

Хто купляе беларускія заводы? Часта мы не толькі не ведаем адказу на гэтае пытанне, але ўвогуле нават не чулі пра тое, што той ці іншы завод прададзены. І ўжо тым больш у Беларусі не прынята тлумачыць грамадскасці, чаму ён прададзены нейкаму канкрэтнаму бізнесмену ці нейкай канкрэтнай кампаніі. Чым яна лепшая за іншых? Чаму не праводзіўся адкрыты конкурс?

Між тым некаторыя здзелкі выглядаюць проста авантурай.

Не так даўно Аршанскі авіярамонтны завод агучыў планы па вытворчасці ў Беларусі верталётаў МСБ-2. У канцы мая на верталётнай выставе ў Маскве была нават прэзентавана мадэль гэтага верталёта.

Што азначае скарачэнне МСБ? “Матор Січ Багуслаеў”.

Хто такі Багуслаеў? Украінскі бізнесмен.

Якое дачыненне ён мае да аршанскага ваеннага прадпрыемства? Выкупіў 59,5% акцый гэтага завода і цяпер хоча тут выпускаць верталёты свайго імя. Прычым партнёрам (каля 40% акцый) выступіла ЗАТ “Сістэмы інвестыцый і інавацый”, якое належала беларускаму алігарху **Уладзіміру Пефціеву.** Гэта той самы Пефціеў, які зарабіў капіталы на продажы зброі і не раз прыводзіў у нашу краіну вельмі сумніўных інвестараў. Што на гэты раз?

Сусветна вядомы часопіс “Форбс”, які раскапаў бізнес-гісторыю **Вячаслава Багуслаева**, лічыць, што і на гэты раз Беларусі наўрад ці пашанцавала.

Уладальнік украінскай кампаніі “Матор Січ” усё жыццё ўздымаў у неба чужыя верталёты. За два дзесяцігоддзі Вячаслаў Багуслаеў вырас ад шараговага інжынера да “чырвонага дырэктара”, галоўнага верталётчыка Украіны.

Сёння 74-гадовы бізнесмен матаецца па свеце. Можа, яму ўжо і не хочацца, але іншага выйсця няма. Бо кампанія “Матор Січ” вось-вось страціць свой асноўны рынак — расійскі. У 2016 годзе ў яе заканчваецца тэрмін кантракта з галоўным заказчыкам — холдынгам “Вертолеты России”. Да гэтага часу расійскі ўрад разлічвае пабудаваць у Санкт-Пецярбургу комплекс, які зможа выпускаць да 600 верталётных рухавікоў у год, а значыць, проста адмовіцца ад украінскіх матораў.

Атрымліваецца, што беларусы прадалі завод інвестару, які мае не лепшыя перспектывы і губляе свой асноўны рынак. Чаму?

Магчыма, адказ — у самой персоне інвестара.

З 47 гадоў работы ў авіяпраме 25 гадоў Багуслаеў узначальвае “Матор Січ”, былы Запарожскі машынабудаўнічы завод. Маторамі гэтага аб’яднання ў свой час былі абсталяваны верталёты канструктарскіх бюро “Камов” і “Миль”, самалёты “Антонов”, “Туполев”, “Ильюшин”, савецкія крылатыя ракеты.

Як Багуслаеву ўдалося праціснуць прыватызацыю кампаніі, якая працавала на абаронку, дакладна не высветлена. Але дзясяткі ўкраінскіх заводаў, якія выпускаюць тэхніку ці камплектуючыя для абаронкі, у 1990-я гады трапілі ў спісы забароненых да прыватызацыі прадпрыемстваў і нават сёння належаць украінскай дзяржаве. А вось Багуслаеў “выслізнуў”. Кажуць, што прычына ў добрых адносінах з былым генеральным дырэктарам “Южмаша”, потым — прэзідэнтам Украіны Леанідам Кучмам.

“*Багуслаеў і Кучма, заўзятыя прэферансісты, нярэдка заседжваліся за картачным сталом, разам адпачываючы ў Крыме,* — успамінае былы гендырэктар Запарожскага алюмініевага камбіната **Уладзімір Бастрыга**. — *Збіраліся ўтрох-ўчатырох, на кон ставілі 10—15 рублёў: на вячэру хапала”.*

Гулялі і больш сур’ёзна. *“Багуслаеў адным з першых выврашыў, што ў прэм’ер-міністры Украіны трэба рухаць выхадца з прамысловасці”,* — апісвае сітуацыю **Уладзімір Гарбулін**, які ў свой час кіраваў сектарам рэкетна-касмічнай і авіятэхнікі ў ЦК украінскай кампартыі. У 1992 годзе “чырвоныя дырэктары” стварылі Міжрэгіянальную асацыяцыю прамысловцаў Украіны, якую ўзначаліў менавіта Багуслаеў, і рэкамендавалі Вярхоўнай Радзе разгледзець кандыдатуру Кучмы на пасаду прэм’ер-міністра. У кастрычніку 1992-га стаўленік дырэктарскага корпусу сеў у прэм’ерскае крэсла, а потым выйграў прэзідэнцкія выбары.

10 ліпеня 1994 года Цэнтрвыбаркам абвясціў Кучму пераможцам выбараў, а праз пяць дзён уласнікам 27% “Запарожскага маторабудаўнічага” стала “Таварыства пакупнікоў”, у якім знаходзіліся 25.000 супрацоўнікаў завода.

Каму “Матор Січ” належыць сёння? Багуслаеў напрамую валодае амаль 15% акцый, 17,3% — у Панамскай афшорнай кампаніі Business House Helena, намінальным трымальнікам 10,5% выступае Bank of New York. Аднак інвестаналітыкі Forbes лічаць, што Багуслаеў кантралюе 51% акцый “Матор Січ”.

Ён меў грандыёзныя планы: аб’яднаць усю ўкраінскую авіяцыю ў адну кампанію, прасоўваць “антонаўскія” пасажырскія і грузавыя самалёты, кааперавацца з расіянамі. Але “аранжавая рэвалюцыя” нанесла балючы ўдар па гэтых амбіцыях. Пасля перамогі ўкраінскай апазіцыі Расія ўзяла курс на аб’яднанне сваёй авіяпрамысловасці пад дзяржаўным дахам і адмовілася ўдзельнічаць разам з Украінай у стварэнні самалёта Ан-70, для якога “Матор Січ” ужо гатовая была выпускаць рухавік. Планы пайшлі прахам.

У сярэдзіне 2007-га Масква ўпершыню загаварыла аб будаўніцтве ў Расіі завода, які мог бы цалкам замяніць “Матор Січ” на мясцовым рынку, выпускаючы па 400 рухавікоў для верталётаў у год. Багуслаеў называў гэтыя планы “ўтапічнымі”. Але паспяшаўся. У 2008 годзе расійскі канцэрн “Оборонпром” стварыў “Объединенную двигателестроительную корпорацию” і пачаў будаўніцтва завода.

На самы гучны расійскі авіяпраект — рэгіянальны самалёт Sukhoi Superjet 100 — замест запарожскага паставілі расійска-французскі рухавік. І гэта быў толькі першы званок. Абысціся без “Матор Січ” расіянам пакуль не ўдаецца, але яны ўсімі сіламі да гэтага рыхтуюцца.

У адказ Багуслаеў задумаўся аб стварэнні дадатковага попыту на свае рухавікі, і так узнікла ідэя заняцца вытворчасцю верталётаў.

“Матор Січ” вяла перамовы з расійскім “Камовым” аб сумеснай вытворчасці шматмэтавага верталёта Ка-226, але праект так і застаўся на паперы. Не задалося і з амерыканскай Sikorsky Aircraft, хаця заснавальнік кампаніі Ігар Сікорскі — былы кіяўлянін. Тады Багуслаеў узяўся за вытворчасць верталётаў сам.

У 2012 годзе кампанія прадставіла абноўленыя варыянты савецкіх верталётаў Мі-2 і Мі-8 — з суфіксам МСБ, а ў маі гэтага года на выставу ў Маскве прывезла мадэль МСБ-2. Праўда, пакуль так нічога і не прадала, бо мадэль яшчэ не сертыфікавана.

Новы невядомы верталёт — гэта праект ці пражэкт?

З аднаго боку, вытворцам верталётаў у бліжэйшыя гады будзе дзе разгарнуцца, прагназуюць спецыялісты амерыканскай даследчай кампаніі Frost & Sullivan. Па іх ацэнцы, спажыўцам у свеце ў 2012—2022 гадах спатрэбіцца больш за 13.000 новых цывільных верталётаў — амаль па 1200 машын штогод.

З другога боку, пакупнікі не давяраюць новай тэхніцы без гісторыі і гучнага імя.

Сертыфікацыя таксама можа зацягнуцца. Так, ад першага палёту амерыканскага Robinson R66 да дазволу на эксплуатацыю прайшло больш за тры гады, а запуск у серыю заняў яшчэ год.

На думку спецыялістаў, адзіны шанц “Матор Січ” выйсці на верталётны рынак — дамовіцца з дзяржавай і прадаваць свае машыны “родным” міністэрствам — абароны, унутраных спраў, ратавальнікам. І толькі потым, праз тры-пяць гадоў, стане ясна, надзейная гэта тэхніка ці не. А значыць, толькі потым і можна будзе гаварыць пра перспектывы праекта.

74-гадовы бізнесмен, аднак, настроены аптымістычна. Нядаўна “Матор Січ” атрымала ва ўласнасць два заводы. Вінніцкі дастаўся кампаніі за даўгі, а Аршанскі беларускае кіраўніцтва прадала свядома. Праўда, перспектывы верталётаў “імя Багуслаева”, як усім зразумела, вельмі цьмяныя. Бо расійскі рынак для іх будзе закрыты, больш за тое, расійскія вытворцы — асноўныя канкурэнты. Так што справа засталася за малым: знайсці недзе ў свеце такіх смелых пакупнікоў, якія захочуць купляць украінска-беларускага ката ў мяшку імя Багуслаева.

Алег СНОЎ.
Па матэрыялах часопіса “Форбс”.

ДИСКУССИЯ

Кого считать тунеядцем?

В "Народной Воле" за 20 августа читателям предложили высказать свое мнение по поводу идеи чиновников взимать в качестве налога с безработных 8 миллионов рублей. На мой взгляд, намерение белорусских властей бороться с "трутнями" и "тунеядцами" просматривается давно. Звучат призывы ввести для "тунеядцев" платное медобслуживание, полную оплату услуг ЖКХ и всякие другие санкции.

Кстати, озвученная официальная цифра "не занятых общественно полезным трудом" лиц — 380 тысяч человек — сильно занижена. Если сравнить численность трудоспособных граждан с численностью занятых в народном хозяйстве только по одной Гомельской области, то получается около 170 тысяч человек, не пополняющих казну деньгами. Если экстраполировать эту цифру на всю республику, то получится около 1 миллиона. Если отминусовать домохозяек и женщин, имеющих право на пенсию по возрасту, все равно получится больше чем полмиллиона.

Считаю инициативу обложения специальным налогом и вредной, и бесполезной. К тому же из предложений Мясниковича не видно, с какого момента безработного будут считать тунеядцем: через месяц после увольнения или через год? У Мясниковича получается, что тунеядцем можно будет назвать любого, кто уволился с работы, — буквально с того самого момента, как человек забрал свою трудовую книжку из отдела кадров. Раз так, то логично было бы вообще запретить людям увольняться по своему желанию. Сталин так и сделал. Но люди бежали с заводов и фабрик, несмотря на угрозу расстрела. Бежали даже во время войны: в Сибири, на Дальнем Востоке, на Севере, где нужда в рабочей силе была высока, принимали и беглых зэков, и людей без документов. Часто там оказывалось сытнее и безопаснее жить, чем в Москве или Питере...

В своем выдвижении фискальных интересов как самых важных для государства белорусская власть все больше смахивает на синьора Помидора из сказки про Чипполино: тот даже на воздух налог ввел. О прочем власть не думает. А зря.

Например, многие из тех, кто не пополняет бюджет, давно живут и трудятся в России и других зарубежных странах. Здесь они только прописаны. Как намерен требовать с них 8 миллионов премьер Мясникович? Наложит арест на квартиру? А она сдана или записана на членов семьи. Прикажет арестовывать денежные переводы? Они деньги наличными привозят. Пошлет запрос в Россию, чтобы изловили должников? Так Россия велика — укрыться есть где. К тому же братским органам нынче не до нас — они Навального ловят...

Среди неработающих много уволенных по статье, ранее судимых. Их брать на работу наниматели не спешат. А неоднократно судимые и трудовых навыков-то не имеют. Услыхав об идее Мясниковича, я вспомнил одного моего знакомого. Отсидев за кражу, он пытался реабилитироваться — найти работу и жилье через биржу труда, райсобес и прочие конторы. Человек он малограмотный, бумажки собирать не умеет, а с него еще и уплатить за что-то потребовали. Так он разбил витрину в магазине, терпеливо дождался патруля и пояснил: "Хотел совершить кражу". Ближайшие два с половиной года о работе и крыше над головой ему думать не придется, чем он вполне доволен. "Счет от Мясниковича" на 8 миллионов может побудить и других людей к похожим поступкам. Государство от этого только проиграет, в том числе и в деньгах.

Не секрет, что среди неработающих много пьющих. Для того чтобы заработать на бутылку, трудоустраиваться незачем: достаточно побыть на подхвате при разгрузке фуры у магазина или на рынке. На коммуналку тоже хватит. Но 8 миллионов для Мясниковича у алкаша не будет. И что тогда? Устраивать его на завод в обязательном порядке? В СССР так пробовали делать. Безрезультатно: алкоголик — плохой работник, и наниматель при первой же возможности его увольнял. Едва ли теперь будет иначе. А у хрона, пьющего годами, и физическое состояние работать не позволяет: поставь его к станку — он еще и беды наделает. Всех пьющих в ЛТП закрыть? И они там будут 8 миллионов отрабатывать?..

А как истребовать 8 миллионов с бомжей и нищих? Среди них хватает лиц трудоспособного возраста. Трутни, говорите? Вот попробовал бы господин премьер-министр порыться в мусорке или посидеть в подземном переходе с протянутой рукой, тогда бы и рассуждал! С их точки зрения — это работа, и очень тяжелая. Если требовать налог и с них тоже, значит, нужно восстанавливать отмененную в 1993 году статью Уголовного кодекса, каравшую за "бродяжничество". Бродяг и нищих от этого не станет меньше — они просто перекочуют в тюрьмы...

Многие белорусы — особенно в малых городах и деревнях — живут с приусадебного участка, с дачи и официально не работают очень давно. Мой знакомый Сергей с высшим образованием, работу в школе бросил лет 20 назад. Перебрался на дачу: у него участок в 60 соток. В город приезжает редко. Часть выращенного продает, и ему хватает на жизнь. Назвать его тунеядцем язык не поворачивается: он вкалывает, как папа Карло! До пенсии ему еще очень далеко. И чиновники наверняка к нему пристанут: "Плати 8 миллионов!" Нету? Тогда бросай участок, пусть бурьян там растет — и иди в дворники!

Впрочем, возможен другой вариант (Мясниковичу на заметку!): обязать лиц, живущих с приусадебного участка, регистрироваться в качестве частных предпринимателей. С уплатой налогов, отчетностью за каждую реализованную морковку, наймом бухгалтера и тому подобным. Наше правительство обожает такие штуки!

На мой вопрос, что он будет делать, получив "счет Мясниковича", Сергей ответил угрюмо: "Смоюсь отсюда". Выиграет ли от этого страна? Сомнительно.

А кто-то ведь и в самом деле уедет. Кто-то, как делалось нередко в СССР, будет оформляться по липовому трудовому договору. Кто-то, чтобы не платить Мясниковичу, станет летуном, меняющим работу каждую неделю. Но вообще-то такие сложности ни к чему. Судите сами: я — не студент, учиться дальше не собираюсь, так что полной платой за образование меня не напугаешь. Квартира, где я живу, формально не моя: с оплатой ЖКХ "на всю катушку" тоже не ко мне. В улучшении жилищных условий не нуждаюсь. А в поликлинику хожу лишь в случае крайней нужды. Теперь же, зная, что с меня сдерут за ее посещение деньги, я вообще буду ждать, пока мне не понадобится "скорая": неотложная помощь у нас, оказывается, бесплатно. Но денег с меня г-н Мясникович не получит ни копейки — даже если меня понесут ногами вперед!

Бороться с безработицей фискальными мерами — утопия. Много денег государство так не заработает. А вот убытки неизбежны — прежде всего в форме роста скрытой безработицы и дальнейшего понижения производительности труда: люди, которых трудоустроили из-под палки, хорошо работать не станут...



Дмитрий ЛИНКОВ, историк.

Гомель.

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

Хто вінаваты ў выбуху?

Напрыканцы лютага ў доме па вуліцы Пляханава здарыўся выбух, у выніку якога загінулі двое — гаспадыня кватэры і яе сын. Ці знайшлі прычыну выбуху?

Ірына Бельская, Мінск.

Якраз днямі Следчы камітэт паставіў кропку ў гэтай справе. Следства адпрацоўвала чатыры версіі таго, што здарылася: няшчасны выпадак у выніку неасцярожнага абыходжання загінуўшых з газавым абсталяваннем; няспраўнасць газавага абсталявання; супрацьпраўныя дзеянні трэціх асоб і суіцыд. У ходзе расследавання тры першыя версіі не пацвердзіліся.

"Па-першае, газавая пліта і газавы лічыльнік у пацярпелай кватэры экспертамі прызнаны цалкам спраўнымі і герметычнымі, а ў момант выбуху ўсе канфоркі былі перакрыты, — распавёў афіцыйны прадстаўнік Следчага камітэта па Мінску **Аляксандр Герасімаў**. — *Па-другое, тэставыя выпрабаванні газавага абсталявання ўсяго пад'езда, праведзеныя спецыяльна створанай камісіяй, выключылі няспраўнасці, здольныя стварыць умовы для ўцечкі газу. Акрамя таго, вентыляцыйная шахта з пацярпелай кватэры з'яўляецца ізаляванай ад іншых кватэр і вядзе прама на дах дома.*

Па-трэцяе, ні ў адной з кватэр, якія пацярпелі ад выбуху, не выяўлена слядоў выбуховых рэчываў і абсталявання, якое працуе ад пераносных газавых балонаў.

Такім чынам, найбольш верагоднай версіяй застаўся суіцыд.

Для стварэння крытычнай канцэнтрацыі сумесі, здольнай выклікаць ўзгаранне ва ўсёй кватэры, патрабавалася не менш за дзве гадзіны бесперапыннага пуску газу, шляхам адкрыцця некалькіх канфорак... Праведзеная пасмяротная комплексная псіхолага-псіхіятрычная экспертыза ў дачыненні да загінуўшага мужчыны ўстанавіла ў яго псіхічнае расстройства, з вялікай доляй верагоднасці здольнае выклікаць спробу суіцыду..."

Даша ПАЎЛОЎСКАЯ.

РЕЗОНАНС

Чиновник, где ты раньше был?

Сегодня нас пугают эпидемией свиной чумы, несколько лет назад запугивали птичьим гриппом и повсеместно уничтожали кур на домашних подворьях.

Мне акция уничтожения свиней напоминает известные годы, когда комиссары в кожанках, размахивая оружием, отбирали у крестьян скот якобы на нужды государства. А у нас, как известно, интересы власти всегда превыше интересов человека. Хоть с высоких трибун и говорится противоположное...

Неприятно смотреть на каменные лица чиновников, выступающих по телевидению и утверждающих о пользе принимаемых мер. Хочется спросить: а где же чиновники были раньше — еще несколько лет назад, когда уже было известно об эпидемии свиной чумы в других странах?

Почему еще тогда не приняли упреждающих мер? Может, тогда не довели бы ситуацию до крайности?

А нынче бедные люди должны отдуваться за чьи-то ошибки, а бедные животные страдать от чиновничьего произвола. Потому что проводимый массовый забой скота не может быть гуманен, и животные испытывают невообразимые боли. И подобные акции не смогут обойтись без последствий: человек будет наказан за эти грехи!

А еще страшно себе представить, что творится нынче в лесах и угодьях, где обитают дикие кабаны, — по версии властей, главные виновники заразы. Охотникам дано право их повсеместно уничтожать, что предполагает уничтожение и других обитателей лесной фауны: кто там будет разбираться? И будут здесь очередные жертвы — косули, лоси и другие животные...

Розалия РУБИНЧИК, пенсионерка, зоозащитник.

ПАСЛЯ СВЯТА



Дзякуй усім!

Сардэчны дзякуй усім, хто павіншаваў мяне з 60-м днём нараджэння, нават калі нехта зрабіў гэта толькі ў думках!

Уладзімір АРЛОЎ, пісьменнік.

ПАМЯЦЬ

Родная мова павышае імунітэт

Гэтак сталася, што нам, чые подпісы стаяць пад гэтым лістом, пашчасціла не толькі пазнаёміцца з ім, але і сябраваць. На глебе, так бы мовіць, айчыннай літаратуры, а галоўнае — надзіва шчырай беларускасці **Івана Вікенцьевіча Ярмаліцкага**.



Толькі ўявіце сабе пры нашай рэчаіснасці такую сцэнку: прыходзіць да хворага на дом па выкліку ўчастковы тэрапеўт — і пачынае размаўляць... па-беларуску! Не вясковы пажылы дзядзька, як камусьці са снобаў уяўляецца беларускамоўны грамадзянін, а прыгожы, пры гальштуку і па фігуры падагнаным гарнітуры, добра паголены, нават у позірку адчуваецца адметны розум, ну і лёгкая прытоеная сумнаватая іранічнасць, звычайна ўласцівая дактарам-ветэранам. Спецыяліст з адной сярэдняй і дзвюма вышэйшымі медыцынскімі адукацыямі.

